Беларускім і расейскім кіраўнікам ужо прыйшло ў галаву аб'яднаць свае падаткавыя сыстэмы цалкам. У адпаведнасьці з падпісанымі саюзнымі дамоўленасьцямі гэта мусіць здарыцца не пазьней, як у 2003 годзе. Падаткавыя ворганы марна моршчаць лобікі, намагаючыся ўявіць сабе гэты заканадаўчы гібрыд. Не прыжывецца на беларускай глебе расейскі падатак на распрацоўку нетраў і здабычу карысных выкапняў. Расейская трохузроўневая і беларуская двухузроўневая сыстэмы падаткаабкладаньня прынцыпова несумяшчальныя. Канешне, можна спрасьціць першую ці ўскладніць апошнюю, але нават тэарэтычныя разьлікі сьведчаць аб глупстве гэтае задумы. Прыкладам, разрэкламаваны 13-адсоткавы расейскі падатак на прыбытак аніяк не стасуецца з беларускай рэчаіснасьцю. Сярэднія адлічэньні нашых грамадзян па гэтым артыкуле складаюць толькі 10 адсоткаў. Падатак на прыбытак можа быць красамоўным індыкатарам узроўню жыцьця беларускіх насельнікаў. Мінімальны памер гэтага пабору ў нашай краіне – 9 адсоткаў. ■

ЗАРОБКІ

Расьпішыцеся ў ведамасьці

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА


Два месяцы працаўнікоў дзяржаўнае прэсы трымалі на галодным пайку. Грошай не было ня толькі на заробкі й авансы, але нават і на камандзіровачныя выдаткі ды ганарары.

Міністэрства фінансаў карміла дзяржаўных журналістаў *"заўтракамі"*, пакуль не сабрала з насельнікаў дастатковую колькасьць падаткаў для фінансаваньня расходных пунктаў бюджэту.


Ягчэ даючы справаздачу перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, міністар фінансаў прысягаў, што ўсе залежныя ад яго бюджэтныя працаўнікі свае летнія грошы атрымалі. Каму сродкаў не дасталося, могуць у міністэрства на скардзіцца. З працаўнікамі сельскае гаспадаркі будуць разьлічвацца старшыні калгасаў, калі прададуць чарговы ўраджай, а зстатнім працоўным народам – тыя, хто прыстроіць прадукцыю, што пыліцца на складах. Першыя могуць сьмела разьлічваць на свае 57 тысяч *BYB*, апошнія – аж на 137 тысяч беларускіх зайцоў.

Гэты год стаў пасьпяховым для доктараў, якія, у адпаведнасьці з дадзенымі міністэрства працы, атрымліваюць амаль па 165 тысячаў зайчанятаў (у сярэднім, ахоўваючы народнае здароўе можна мець па 95 тысяч штомесяц), і ворганаў кіраваньня на бюджэтным утрыманьні, якім плацяць па 72 даляры. Так несамавіта ўзнагароджваецца праца толькі шараговых клеркаў і бюракратаў. Буйнейшы чыноўнік атрымлівае грошы ў бугалтэрыі савміну ці адміністрацыі прэзыдэнта. Там расцэнкі на парадак вышэйшыя, але канкрэтныя лічбы ў міністэрстве працы не раскрываюць. Выкладчыкам жывецца трошку горш, чым урачам, і на шмат горш, чым пазабюджэтнаму чыноўніцтву. Міністэрства працы пастанавіла выплочваць ў сярэднім па 92 тысячы *BYB* школьнаму настаўніку й па 166 тысяч – ВНУшнаму прафэсару.

Ня ўсе гэтыя людзі могуць разьлічваць на сто даляраў у жніўні, ня кожны атрымае свой стольнік і з трынаццатай зарплатай. Міністэрства працы заявіла, што зялёная сотня таксама велічыня сярэдняя. Таму прыбіральнічкі, ня важна дзе шуруюць іх швабры, у мінфіне ці калгасным клюбе, няхай вушы на прэзыдэнцкія абяцанкі не разьвешваюць. ■



СПОРТОБЗОР



Возвращение Иванишевича

Завершился третий турнир из серии «Большого шлема» – открытый чемпионат Англии, разыгранный на кортах Уимблдона. Подлинным его триумфатором стал Горан Иванишевич. Напомним, что долгое время он не играл из-за травмы, затем медленно набирал форму. В итоге он оказался во второй сотне теннисистов мира по рейтингу АТП. Многие уже стали забывать о нем, не рассматривая в качестве претендента на победу в топовых турнирах. Однако хорват сумел доказать, что былая игра к нему вернулась, и он не намерен никому уступать.

Если кто-то и недоволен успехами Иванишевича, так это англичане. С 1938 года представители туманного Альбиона не выступали в финалах «Уимблдона», и англичане надеялись, что именно в этом году неудачная для них серия будет нарушена. Все свои надежды на это историческое событие они возлагали на Тима Хенмена. И он мог победить, если бы не дождь. Ведь поначалу Хенмен полностью переигрывал Иванишевича, который демонстрировал на удивление бледную игру. Все изменилось после вызванной дождем паузы. Хорват преобразился и переиграл молодого англичанина. Так что англичанам придется еще подождать.

Соперник Иванишевича по финалу определялся в противостоянии пары Патрик Рафтер – Андре Агасси. В изнуряющем пятисетовом поединке оба доказали свое право выступить в финале, но более удачливым оказался Рафтер. Правда, затем он в столь же упорной борьбе уступил титул чемпиона Иванишевичу.

В женском турнире наибольший интерес вызывало выступление Дженнифер Каприатти. Сумеет ли американка выиграть «Большой шлем»? Ответ на этот вопрос пришлось ждать довольно долго, вплоть до четвертьфинала. В итоге он оказался отрицательным. В целом женский турнир, за исключением вылета на самом старте Мартины Хингис, никаких неожиданностей не принес. Борьбу за титул вели именно те, кто превосходит остальных в табели о рангах. В итоге турнир во второй раз подряд выиграла Венус Уильямс, легко переигравшая в полуфинале пусть и очень талантливую, но недостаточно опытную Жюстин Энен из Бельгии.

Уровень запросов

Как оценивать успешность выступления команды? Конечно, по результатам. Другое дело, какой результат является успехом. Здесь уже все упирается в реальную оценку возможностей той же команды, да и всего вида спорта в целом. Простейший пример. Еще в прошлом отборочном цикле ничья нашей футбольной сборной в поединке с норвежцами на их поле расценивалась бы как безусловный успех, а сейчас мы уже недовольны. Мы привыкаем к победам и верим в силу своей команды.

Старт европейских футбольных турниров, безусловно, вызывал тревогу. Ведь те времена, когда мы могли сказать, что ряд соперников не представляет для нас проблемы, давно миновали. Мы уже успели проиграть представителям всех мыслимых стран. Именно поэтому выступления минского «Динамо» в кубке Интертото уже можно рассматривать как успешное (второй поединок минчане выиграли 1:0). И нет смысла говорить о том, что «Хапоэль» из Хайфы играл не основным составом, что у них межсезонье. В прошлом, а тем более в позапрошлом году наши клубы и не таким соперникам благополучно проигрывали. Нужно просто признаться себе, что уровень запросов к нашим футбольным командам за время суверенитета существенно изменился. Наш клубный футбол оказался в огромной яме, выбраться из которой в одночасье невозможно. Для этого понадобиться долгая и кропотливая работа и победы. Пусть пока такие, но победы, которые вернут нам уверенность в наших силах. Следующим соперником минчан станет немецкий «Вольфсбург», первую встречу с которым они проведут 14 июля на поле соперника. Кроме того, 11 июля поединком с фарерским «Вагуром» стартует в розыгрыше еврокубков и наш чемпион – мозырская «Славия».

7-8 июля состоялись игры двенадцатого тура чемпионата страны. Ключевой поединок прошел в Солигорске, где местный «Шахтер» принимал лидера чемпионата борисовский «БАТЭ». Солигорский клуб, здорово прибавивший в середине сезона, уверенно провел и эту встречу и заслуженно победил 1:0. Хотя поединок мог сложиться и по-другому, реализуй форвард гостей Кутузов пенальти, но на стороне «Шахтера» выступила фортуна в лице их голкипера Мартешкина. После этого поражения борисовчан в первенстве не осталось ни одной команды не знавшей горечи поражений. Остальные встречи принесли следующие результаты: «Гомель» – «Торпедо-МАЗ» 2:3, «Нафтан-Девон» – «Ведрич-97» 2:0, «Молодечно-2000» – «Неман-Белкард» 0:3, «Динамо» Бр. – «Локомотив-96» 3:1, «Славия» – «Днепр-Трансмаш» 4:2 (матч состоялся 5 июля). Таким образом, группа лидеров не претерпела серьезных изменений. Во главе турнирной таблицы с двадцатью девятью очками «БАТЭ», «Белшина» – 23 очка, «Неман-Белкард» и «Шахтер» – по 22 очка.

Укололся и пошел

С 3 по 8 июля прошел чемпионат Европы по фехтованию. Наибольшие надежды белорусские болельщики возлагали на команду саблистов, чьи выступления позволяли надеяться на хороший результат. В итоге все получилось вопреки ожиданиям. Уже в первый же день соревнований в копилке белорусской команды оказалась одна золотая медаль. Приятный сюрприз нам преподнес Виталий Захаров, выигравший личное первенство среди шпажистов. К сожалению, это оказался единственный успех нашей команды. Ни личные, ни командные соревнования рапиристов и саблистов положительных результатов не принесли.

Подготовил Сергей ВИТАЛЬЕВ

МУЗЫКА

З новым рокам, з новым колам

ВІТАЎТ МАРТЫНЕНКА.

Убачыўшы афішы XII "Рок-кола", лянівыя ў розных гарадах Беларусі, напэўна, падумалі: "Наваполацак? Далякавата. Пачакаем, пакуль усе гэтыя рок-зоркі і маладняк прыедуць да нас." А я дык проста выбег з хаты без доўгіх збораў у шортах і футболцы з надпісам "Выбірай" і апынуўся ў Наваполацку.

Фантастычна? Ды не. Проста дарогу да вакзала я не лічу за напругу, а апынуўшыся там апоўначы кладуся спаць у купэ цягніка "Баранавічы–Полацк", каб раніцай паснедаць у кавярні наваполацкага гатэлю "Крыніца", куды гасцей засялілі гасцінныя арганізатары. І футболка "Выбірай", аказваецца, ледзь не сімвал фэсту, за які фанаты гатовы аддаць любую сваю рэліквію.

Апоўдні пачаўся першы конкурсны канцэрт. І гэта дзесяцігадзінны рок-марафон з кароткім перапынкам на абед. Аж 28 гуртоў з розных куткоў Беларусі, ды яшчэ госці з Кёнігсберга – гурт *GAROTTA*, і экс-свае *THE STOKES*. Сярод знакамітых ужо адмыслоўцаў рока (прадзюсер Генадзь Сыракваш, журналістка Таццяна Заміроўская, менеджэр *BULBA RECORDS* Раман Арлоў, рок-музыка з Расіі Максім Суслаў) займаю месца ў журы. Мы выслухалі інтэлігентны спіч загадчыка аддзела культуры наваполацкага гарвыканкама, і пайшоў рок.

Спярша – канцэрт лаўрэатаў мінулага "Рок-кола": смачны *country-beat* гурта "Мы" ды англамоўная ірландшчына гурта *Ozon* (гэткі наваполацкі *Bono*).

Па шчырасці, не люблю эпігонаў, таму больш уразіў наіўны меладызм полацкай "Версіі". Сцэнічны вопыт яшчэ малы, выканаўчыя здольнасці сціплыя, але кантакт з публікай знаходзяць імпэтна. Добры гурт для разагрэву публікі на канцэртах хоць каго заўгодна (хоць *N.R.M.*, хоць *NAZARETH*).

Змена геаграфіі, змена дэкарацыяў, змена настрояў – белаазёрскі "Бардак *house*". Берасцейшчына мае свайго Мэрыліна Мэнсана. Музыкі мала, але якое шоу!... Гэта ўжо не мастацкая самадзейнасць, а прафесійны прадукт. Вось каго хацелася б бачыць у шэрагах беларускамоўнага рока, але хоць франтмэн лёгка размаўляў па-беларуску, спяванне на гэтай мове назваў для сябе "*нячэсным*", спаслаўшыся на сваё расейскае паходжанне. Такую прынцыповую "*чэснасць*" выяўлялі потым многія, нават дзеці "*зямлі-маткі маёй*", якія «*чэсна*» пагадзіліся з колішнім гвалтоўным надломам іх душ.

Іншую чэснасць спавядае мінскі "Бульдозер": як двухаблічны Янус, ён двухмоўны. То *"Ляці, ляці бусел"*, то *"Человечество сгниет в этой страшной войне"*. Няўжо не чуюць хлопцы, што ў іх адразу два розных гурты: то кранальна-меладычны, то банальна-наіўны?

Вось мінскія ж "Цмокі" – гэта ўжо цэльны, дынамічны калектыў. Сцэнічны вопыт гарантуе ім трывалыя пазіцыі на прафесійнай сцэне: знаёмыя паводле "Вольных танцаў" хіты хлопцы са сваёй скрыпачкай адкаталі чысценька, як з кампакт-дыску, дый новыя кампазіцыі гэтак жа прагучалі.

Зрэшты не падумайце, што праблема толькі ў кволасці пачуцця нацыянальнай свядомасці некаторых беларускіх артыстаў або ў стылістычных прыярытэтах асобных сяброў журы: я сам з задавальненнем аддаў свой голас за бліскучы прафесіяналізм англамоўных дэз-юнакоў з Наваполацка "Тэургія" і рускамоўных каралёў блюза з Мінска *MADERA HARD BLUES*, хоць творчасці тых і другіх шкодзіць адсутнасць культурнага кантэксту. Але вечнае сутыкненне крытэрыяў мастацкасці і прафесійнасці, поўная адсутнасць аналітычнай рок-крытыкі, якую з сумнеўным поспехам замяняе рэкламнае радкагонства музычнай прэсы – усё гэта вядзе да перараджэння мас-культуры ў аморфны пазакультурніцкі субстрат. Ці не ў тым праблема беларускага шоу-бізнесу, што ён не звязаны з жыццём грамадства (гэта яму пад сілу) і не падтрыманы сур'ёзнай рэкламай (гэта ад яго не залежыць, бо ў кволую расійскую Алсу ці "Нану" укладаецца больш грошай, чым у бліскучы мінскі унікум *MADERA HARD BLUES*).

Цікава, што "*чэсная*" *MADERA HARD BLUES* пазней згадзілася паспрабаваць сябе ў якімсьці з культурніцкіх праектаў "БМАgroup" кшталту "Вольныя танцы". Але будучыня пакажа. Ва ўсялякім разе я б сам з задавальненнем пераклаў на вынішчаную мову нашых бацькоў любую іх песню (асабліва "*Гэта не рок-н-рол*", якая так прыцвічыла мяне на канцэрце).

Дзякаваць Богу, не ўсё татальна кепска на рок-сцэне. І гэта выразна адчуваецца, калі выступае гарадзенскі "Твар", баранавіцкі "Бровар", аршанскі "Корд", мар'інагорскае "Аварыйнае выйсце". Гурты яўна рознага ўзроўню: славуты ўжо інды-рокавы "Твар" і чамусьці малавядомае ўнікальнае "Выйсце" (гэта нікім не занятая ніша беларускага музычнага гумару). І калі "Бровар" толькі паказвае перспектыўныя творчыя патэнцыялы, дык гэткія ж пачаткоўцы "Корд" ужо тут, на "Рок-коле" здолелі сарваць авацыі публікі сваімі песнямі "Краіна", "За плячыма", а "Адлюстраванне" давялося нават выконваць на біс.

Прыблізна такога ж узроўню бярозаўскі "Бардак *house*" (дасціпная школьная самадзейнасць), але сярод хітоў іх прыхардаванага брыт-попа знайшлося месца і боскаму дару сапраўды чароўнай мелодыі ("Гэта радзіма мая"), з якой сур'ёзны прадзюсэр мог зрабіць бы шэдэўр, не горшы за *July morning URIAH HEEP*, *Stairway to heaven LED ZEPPELIN* ці хоць бы "Пляц Францыска" (*ULIS*).

Прыпыніўшыся тут, загадайце сабе загадку: хто ж выйшаў у лаўрэаты? А вось за гэта не ўзяўся б нават я, бо канфлікт маіх крытэрыяў мастацкай вартасці з татальным засіллем прафесійнага рамесніцтва прымусіў мяне катэгарычна адмовіцца ад майго ўдзелу ў рэзюмэ калег. Я ўжо не кажу пра таленавітую плеяду "*надзеяў беларускага рока*" ("Бровар", "Корд"), яны не заўважылі нават тых, чыё станаўленне ўжо адбылося і зафіксавана ў сур'ёзных рэлізах. Хто ж перамог?

Смяяцца будзеце, але калі на "Рок-каранацыі" намінацыю "Традыцыі і сучаснасць" выйграюць тыя, хто не забывае сапраўды глыбінных традыцыяў нашага этнасу ("Юр'я", "Крыві", "Палац"), дык тут ушанавалі "*глыбінныя традыцыі*" тутэйшага рускамоўнага металу.

Прыз "За самабытнасць", заслужаны "Аварыйным выйсцем", я назваў бы прызам за арыгінальнасць, бо і мяне ўразіў іхні своеасаблівы беларускі скіфл (інструментарый быў звышнетрадыцыйны для рока), але чым лаўрэат *JITTERS* лепшы за праігнараваных цалкам "Цмокаў" – ніколі не зразумею.

Дзеля статыстыкі дадам таксама, што лаўрэатамі сталі "Деяния", *DEADMARSH* і "Теургия". Апошнюю сапраўды разам з *MADERA HARD BLUES* (спецпрыз *X-NOISE FACTORY*) хоць сёння па Еўропе можна катаць, што пацвярджае і вынік глядацкіх галасаванняў. Можна пагадзіцца і з "Лепшым вакалам" (*RAVENS*) ды "Лепшым шоу" ("Бардак *house*"), але калі для "БН" прыдумалі намінацыю "За меладызм", дык як было не прыдумаць (а прасцей выбраць з наяўнях вартасцяў) што-небудзь для "Цмокаў" (за дынаміку развіцця, за канцэптуальнасць творчасці, за стылістычную непаўторнасць, дый вакаліст мог бы паспрачацца з *RAVENS*, не кажучы пра гітарыста, які да таго ж там жа, на фэсце здолеў пераплысці Дзвіну)?

Як бачна, не патоне без прызоў "Рок-кола", а вось ці будзе яно ганарыцца гадоў праз дзесяць ушанаванымі "Дэдмаршамі", "Деяниями", "Рок-КИ", як сёння ганарыцца "Мясцовым часам", "Мрояй" і "Крамай", якіх падымала і наваполацкая сцэна?

Фінальны канцэрт другога дня быў прывабны паўторам лепшых (але далёка не ўсіх) момантаў першага, а таксама бліскучым выступам гасцей, сярод якіх я асабліва чакаў выступ новага тандэму "*Exist &* Харлі". Што ж, магутна, але не цэльна.

Кёнігсбергская *GAROTTA* акрамя зладжанага прафесійнага дыхту здзівіла публіку яшчэ і еўрапейскімі адносінамі да саміх сябе: хоць у складзе гурта ніводнага беларуса (толькі расейцы і латышы), яны пачалі канцэрт выразнай праявай павагі да гэтай зямлі, да яе традыцыяў: "*Добры вечар, Наваполацк! Вас вітае гурт GAROTTA!*".

Бліскуча выступіў пад 13-м нумарам праграмы маладзечанскі *HAPPY FACE*. Бачылі б вы двайное сальта між калонкамі з гітарай у руках ды розныя трайныя тулупы з пераваротамі, якія вырабляў гітарыст Янка Марчанка (аж нават галава ў паветры на пятках ляжала). А якія хіты – "Палітычны рай", "Месца ў хіт-парадзе", "Сэнс". Публіка аж перакаўбасілася ля сцэны. А тут яшчэ заява музыкаў аб канчатковым звароце да беларускай мовы. Вось яны, здаровыя людзі, выхаваныя Еўропай.

Усё ж "Рок-кола" пакуль яшчэ застаецца кузняй беларскіх рокзорак, як пісала прэса 90-х, але часам даводзіцца засцерагацца, каб ейны молат не ўдарыў па жывому. Шаную намаганні Сяржука Анішчанкі як арганізатара і ягоны артыстызм як вядучага, шаную спробу Генадзя Сыракваша распачаць лічбавы аўдыёархіў фестываля, але ўжо не ганаруся, што сам быў сябрам журы. Мне сорамна, што не хапіла аўтарытэту і аргументаў адвесці мастацкае журы ад банальных экзаменаў музычных рамеснікаў.

Чаму ў літаратуры віртуозны пісар ніколі не пераўзыдзе сапраўднага генія, які валодае не каліграфіяй, затое душой? Сотні навукоўцаў ужо не адно дзесяцігоддзе б'юцца над мазграй Язэпа Дылы, каб неяк прачытаць ягоны раман "З варагаў у грэкі", хоць каліграфічнае графаманства іншых ім было б лягчэй разабраць. Калі яны валодаюць крытэрамі мастацкай якасці, дык што ж музычныя адмыслоўцы не выб'юцца са спажывецкіх крытэраў анадзённага рынку?

■

НОВОСТИ КУЛЬТУРЫ

ВЫСТАВКА. 9 июля в галерее Белорусского союза художников «Мастацтва» в Минске открылась выставка натюрмортов и пейзажей известного белорусского живописца Владимира Ходоровича.

По словам самого художника, родившегося в Слуцке в 1947 году, его раннее детство прошло в крестьянской семье, и уже с четырех лет он рисовал углем и карандашом. После переезда семьи в Минск будущий мастер стал заниматься у видного белорусского художника и педагога Анатоля Барановского в студии Дворца культуры Минского тракторного завода. Затем продолжил обучение в Минском художественном училище имени Алексея Глебова и Белорусском государственном театрально-художественном институте. С 1977 года Ходорович регулярно выставляет свои произведения на республиканских и международных выставках. Его удивительно теплые реалистические работы, в которых цветные пятна тонко гармонируют с серебристыми тонами воздуха белорусских горизонтов, стали хрестоматийными.

На нынешней выставке, которая продлится до 19 июля, представлено около 20 работ Владимира Ходоровича. На них среди цветов и фруктов можно увидеть национальную керамику и музыкальные инструменты, старинную деревянную скульптуру и плетеные из бересты туеса, кованые подсвечники и старопечатные издания Франтишка Скорины, работы вязальщиц и бондарные изделия. По словам художника, эти своеобразные памятники национальной культуры, изображенные на холстах, «*передают душу создавшего их народа*».

ПИЛИГРИМЫ. По городам Беларуси начал свое движение культурно-просветительный караван «Пилигримы», организатором которого выступает республиканское молодежное общественное объединение «Некст Стоп – Нью Лайф».

В караване принимают участие музыканты и актеры различных направлений, барды и фольклорные группы, журналисты и художники, массовики-затейники. Всего в проекте участвуют 70 человек (по 35 в каждом из 2-х автобусных маршрутов).

Караван начал движение из Минска 8 июля. Разделившись на два потока, он пройдет через Молодечно и Борисов (9 июля), Сморгонь и Новополоцк (11), Лиду и Витебск (13), Гродно и Оршу (15), Новогрудок и Могилев (17), Барановичи и Ганцевичи (19 июля).

Во время второй части акции караван пройдет через Солигорск и Брест (26 июля), Слуцк и Кобрин (28 июля), Бобруйск и Пинск (30 июля), Кричев и Мозырь (1 августа), Горки и Гомель (3), Крупки и Жлобин (5 августа). Завершится же акция 7 августа феерическим гала-концертом в Минске. Программа каравана включает концерт, культурную акцию и пресс-конференцию в каждом городе. В программе концертов – выступления музыкальных групп, следующих в караване: «Тяни-толкай», «Жнюв», *Jizel`s band*, *Jazzgrover*, «Любовь и спорт», местных музыкальных коллективов, театральные перфомансы, скетчи. Во время акции художники-плакатисты вместе с желающими будут работать над созданием плакатов по темам «Я и мое общество» и «Будущее моей страны».

■

МОЛАДЗЬ

ТЭРЫТОРЫЯ СВАБОДЫ

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

Вадамёты й аўтобусы з паліцыяй, правакацыі службы бясьпекі і пільны нагляд узмоцненых памежных сіл — у такіх умовах праходзіў інтэрнацыянальны летнік "*NO borders!*" на беларуска-польскай мяжы.

Беларуская моладзь таксама прыняла ўдзел у агульнаэўрапейскай акцыі пад дэвізам "Нелегальных людзей не бывае!", прысьвечанай барацьбе супраць узмацненьня межаў і за свабоду перамяшчэньня. Мястэчка Крынкі на польскай мяжы, дзе знаходзіўся летнік, на тыдзень стала адной з цэнтральных крыніцаў інфармацыі заходніх незалежных СМІ.

Моладзевыя летнікі – вельмі папулярная гэтым сезонам форма арганізацыі для той авангарднай моладзі, якая жадае актыўна зьмяняць сьвет. Палітычныя, культурныя актывісты, маладыя журналісты й проста ўсе зацікаўленыя зьбіраюцца разам для нефармальнага абмену досьведам, кантактаў, правядзеньня разнастайных хэпенінгаў. Фактычна, гэта альтэрнатыўны саміт – з палаткавай дэмакратыяй, канцэртамі, працай з мясцовым насельніцтвам.

Мэтай чатырох летнікаў, што адначасова праходзілі ў розных месцах Эўропы, стаў пратэст супраць іміграцыйнай палітыкі Эўрасаюза. Як вядома, адной з умоваў эўрапэйскага рынку зьяўляецца надзейнае закрыцьцё межаў ад эмігрантнаў з Трэцяга сьвету.

Абываталяў, выхаваных у эпоху жалезнай заслоны, гэта, зразумела, не шакіруе. А вось моладзь не зьбіраецца падзяляць людзей на першы й другі сорт па месцах іхнага пражываньня. Есьці хлеб з маслам, ведаючы, што за сьцяной дохнуць з голаду – філязофія, на іхную думку, даволі сьмярдзючая. "Нелегалаў", што прабіраюцца ў Эўропу, часам чакае лёс, параўнальны з лёсам габрэяў трэцяга рэйху. Для памежных чыноўнікаў яны не людзі, а аб'екты дэпартацыі. Нядаўна быў дзікі выпадак гібелі дэпартаванага эміграната проста ў салёне самалёта. На небараку апранулі шлем, кайданы і запакавалі ў самалётнае крэсла пад паліцэйскім канвоем. Вынік – сьмерць ад асфіксіі.

Распавядаць аб прычынах, якія прымушаюць эўрапейскую моладзь пратэставаць супраць існуючых парадкаў, можна доўга. Галоўная зь іх – канфлікт філязофіі старога пакаленьня ва ўладзе й новага, якое разважае сёньняшнімі прынцыпамі. Для першых няма нічога дзіўнага ў падзеле людзей на катэгорыі з рознымі правамі – гэта кантэкст сусьветнай палітыкі мінулага стагоддзя. Для сучаснай моладзі любы падзел людзей зьяўляецца сьмяротнай абразай і рудыментам аўтарытарызму.

Ясна, што гэтыя пазыцыі яшчэ не набылі моцнага гучаньня ў сьценах эўрапарламэнту. Уласна, увядзеньне іх у кантэкст сучаснай палітычнай дыскусіі й зьяўляецца мэтай актывістаў "*No borders!*". А пакуль гэтага не адбылося, канфлікт вырашаецца "*ў палявых умовах*", за якімі асабліва цікава назіраць беларусам – усё ж такі нашая краіна можа лічыцца эўрапейскім флагманам па барацьбе з іншадумствам.

Перашкоды, якія польскія ўлады стварылі крынкаўскаму летніку, выклікалі ажыятаж сярод эўрапейскіх журналістаў і шчырае захапленьне беларусаў – заходнія суседзі годна пераймаюць айчынны перадавы досьвед. Дзе-нідзе яны нават пераплюнулі настаўнікаў, не на жарт спужаўшыся міжнароднай альтэрнатыўнай акцыі. Польскае мястэчка стала лідарам інфармацыйных паведамленьняў, прысьвечаных агульнаэўрапейскай акцыі. Напрыклад, наіўных амэрыканцаў вельмі зьдзівіла практыка, калі людзі ў цывільным зацягваюць арганізатараў у машыну і пад дулам пісталета выпытваюць падрабязнасьці арганізацыйнай працы.

А чаго вартае звальненьне дырэктара крынкаўскага ДК, які даў згоду на правядзеньне некаторых культурных мерапрыемстваў? Шантаж, запалохваньне арганізатараў – усё гэта да болю знаёмыя малюнкі з роднай беларускай рэчаіснасьці. Апафеозам цырку, пасьля якога мясцовы жыхары канчаткова здружыліся з актывістамі летніку, стала прыцягненьне двух вадамётаў і 19 паліцэйскіх аўтобусаў для падаўленьня бяскрыўднага хэпенінгу ў Крынкаўскім парку. Атрымаўшы пад гарачую руку ад адных і паназіраўшы за другімі, крынкаўчане канчаткова вызначыліся ў сваіх сымпатыях на карысьць незвычайных турыстаў.

Пасьля безвыніковых спробаў якнебудзь заперашкодзіць, паліцыя нарэшце пакінула міжнародны летнік у спакоі. Але сытуацыя была вельмі прыкольнай. З аднаго боку, у самім кэмпінгу панавала атмасфэра міру й спакою. Затое, калі хтонебудзь у адзіночку аддаляўся ад месца дыслякацыі, ён адразу трапляў у рукі ўзмоцненых памежных сіл, якімі літаральна напічкалі крынкаўскі раён. Такім чынам актыўна папаўняліся сьпісы будучых "неўязных" у Эўрасаюз.

Трэба заўважыць, што акцыя, у якой прымалі ўдзел і беларусы, атрымала вялікі міжнародны рэзананс у незалежных СМІ. Была запляванаваная нават інтэрнэт-трансляцыя адразу з чатырох "гарачых кропак" культурнага моладзевага пратэсту – у Польшчы, Велікабрытаніі, Гішпаніі й Славеніі. І гэта толькі пачатак новай эўрапейскай кампаніі за роўныя правы на перамяшчэньне для ўсіх.

Удзел беларускай дэлегацыі ў міжнароднай акцыі вельмі сымбалічны. Паводле ўсіх клясыфікацыяў, нашыя краіны мусяць стаяць па розныя бакі барыкадаў. У сувязі з узмацненьнем візавага рэжыму неўзабаве беларусы могуць стаць для палякаў персонамі нон-грата. Але адна з мэтаў летніку якраз і заключалася ў дэманстрацыі адзінства моладзі з "разьвітых" і "недаразьвітых" краінаў у супольным непрыняцьці новых падзелаў Эўропы й пабудовы вялікіх сьценаў, што рвуць чалавечыя кантакты.

Але, як і па ўсёй Эўропе, гэтая праблема ня вельмі засмучае айчынныя ўлады і апазыцыю. Фактычна, розьніца паміж нашымі заходнікамі і славянафіламі заключаецца толькі ў пытаньні, якую з межаў – заходнюю ці ўсходнюю – трэба надзейна зачыніць для "нелегальных людзей". Само гэтае спалучэньне не рэжа ім вуха. Максымум, што цікавіць палітыкаў – праблема эканамічнай і палітычнай ізаляцыі. Чалавечыя кантакты зноў застаюцца на апошнім месцы. Як трапна заўважыў адзін з калегаў, усё таму, што самі палітыкі ездзяць па дыппашпартах.

Летнікі, падобныя крынкаўскаму, набываюць усё большы размах, яднаючы моладзь розных краін вакол рэальных праблем. Не выключана, што на нашых вачах нараджаецца новая "народная дыпляматыя", існуючая насуперак забабонам і перашкодам. Пасьля палітычнай сьпячкі 90-х моладзь зноў патрабуе зьменаў. І гэта сьведчыць пра тое, што чуткі аб сьмерці новага пакаленьня, атручанага MTV, рэклямай і пэпсі-колай, значна перабольшаныя. ■

З НАГОДЫ

«БАСОВІШЧУ» 12 ГАДОЎ


СЯРГЕЙ СТАВЕЦКІ

«Басовішча" — фестываль музыкі маладой Беларусі, які селета вось ўжо 12 раз мае адбыцца ў польскім мястэчку Грудэк 21–23 ліпеня, без перабольшвання ўжо даўно стаў сапраўднай легендай сярод аматраў беларускага року. Арганізатарам штогадовага фэсту з'яўляецца Беларускае аб'яднанне студэнтаў у Польшчы (БАС).

Першае "Басовішча" адбылося ў 1990 годзе. Менавіта тады, улетку, група беларускай моладзі з Беласточчыны вырашыла арганізаваць свята. У адносінах паміж нацыянальнай большасцю і нацыянальнымі меншасцямі заўжды і паўсюль існуюць пэўныя напружанні. Віной таму негатыўны гістарычны вопыт і ўсталяваныя ў грамадстве стэрэатыпы. Але моладзь на тое і моладзь, каб разбураць бар'еры і ламаць стэрэатыпы. Беларуская музыка ўспрымалася на пачатку 90-х як выключна фальклорная з'ява, старадаўнія народныя песні, якія пяюць бабулі ў вышываных кашулях. Менавіта таму БАС вырашыў арганізаваць рок-фэст. Такім чынам беларуская моладзь хацела прадэманстраваць і самім сабе, і палякам: "*Мы такія ж, як і вы*".

Гэта быў крок у накірунку разбурэння пануючага ўяўлення пра беларускую культуру як нешта, чым могуць цікавіцца толькі людзі сталага ўзросту, нечага абсалютна адарванага ад рэчаіснасці, несучаснага і нецікавага. Рок-фэст меўся стаць важкай дэкларацыяй сучаснасці беларускасці. Варта адзначыць, што ўсе гэтыя мэты былі дасягнуты. Цяпер "Басовішча" і беларускі рок ведаюць далека за межамі і Грудэка, і ўсяго Беластоцкага ваяводства. "Басовішча" стала своеасаблівай брамай у Еўропу для беларускіх рок-музыкаў. А штогадовы фэст збірае людзей не толькі з Беласточчыны і Беларусі, а нават з заходняй часткі Польшчы, і з'яўляецца найбуйнейшай рок-імпрэзай у ваяводстве.

Першае "Басовішча", якое цяпер з настальгіяй успамінаецца ўсімі олдавымі беларускімі дзеячамі, сапраўды было выключнай з'явай. Энергія і нонканфармізм маладосці, скіраваныя ў канструктыўнае рэчышча, стварылі першы сапраўдны сучасны беларускі рок-фэст. Першы раз на адной сцэне



выступалі беларускія гурты з Польшчы і з Беларусі. Барды, а побач рок-гурты, умова адна – спяваць па-беларуску. Змест... Што тут казаць пра змест, калі на вуліцы 1990 год! І ў Польшчы, і ў Беларусі, тады яшчэ савецкай і сацыялістычнай, адбываюцца рэвалюцыйныя змены. Камуністычны таталітарызм канае і выступаючыя на фэсце непадцэнзурныя Сяржук Сокалаў-Воюш, Алесь Камоцкі, "Мроя" і "Уліс", здавалася, забівалі апошнія цвікі ў яго труну. Рэакцыя на фэст і ў Польшчы, і ў Беларусі была практычна аднолькавая. Перадаць яе можна адным словам: "Перамога!". Мяжа, кіламетры калючага дроту, суровыя вартавыя, бязлікая бюракратычная машына і шматлікія іншыя перашкоды, што падзяляюць моладзь суседніх краін, былі пераадоленыя. Свята атрымалася. "Басовішча" стала адным з найгучнейшых і найбольш масавых беларускіх рок-фестываляў.

Пасля фэсту арганізатары зразумелі, што імпрэза павінна быць штогадовай. Аднак "Басовішча" нумар два – гэта ўжо трохі іншае "Басовішча". *"Сёлета, ва ўмовах новай гаспадарчай сістэмы, над энтузіазмам узяў верх тоўсты кашалек. Іначай быць не магло. Іначай ужо не будзе!"* – напісаў у адзіным у Польшчы цалкам беларускамоўным тыднёвіку "Ніва" Аляксандр Максымюк. Таму не дзіўна, што канферанс'е, які вёў фэст, заявіў: *"Калі ўжо хтосьці хоча даведацца, а пад якім жа заклікам праводзіцца "Басовішча", дык я адкажу – пад заклікам "Make love not children", што тлумачыцца па нашаму: "Кахайце, але не рабіце дзяцей". Я не ведаю імпрэзы, якая так як наша была б пазбаўлена палітычных, эканамічных, маральных і якіх там яшчэ падтэкстаў. І таму не верце нікому, хто будзе пасля прышываць "Басовішчу" нейкія латкі. "Басовішча" ёсць імпрэзай чыста эратычнай. Прынамсі да гэткай імкнецца. У сферы эстэтычнай "Басовішча" падтрымлівае музыку нашага веку – rock'n'roll – адвечны эратычны рытм чалавецтва. У сферы сацыяльнай "Басовішча" не падтрымлівае нічога. А пратэстуе супраць аднаго: супраць забароны продажу прэзерватываў у Польшчы і ўвогуле ў свеце. Кажучы агульна, пратэстуе супраць таталітарызму ў эратычным жыцці чалавека"*.

Эпоха пратэсту і супрацьстаяння, прынамсі ў Польшчы, скончалася, а разам з ёй мода на "сацыяльны рок". Упершыню фэст падзяляецца на дзве часткі: першы дзень – конкурс маладых гуртоў, другі дзень – канцэрт зорак. Арганізатары асэнсавана, ці, што больш верагодна, інтуітыўна паставілі фэст на торы шоу-бізнеса. Гэта адразу прынесла пэўныя вынікі. Так, "Уліс", гурт, у які закахалася амаль ўся беластоцкая моладзь, два разы ўдзельнічаў у найвялікшым польскім эстрадным фестывалі, што адбываецца ў Сопаце. "Крама" падпісала кантракт на выступы ў Велікабрытаніі, вынікам якіх стала выдадзеная там кружэлка "Vodka on Ice". Сваю заслугу ў гэтым мае і "Басовішча", на якім заўжды прысутнічае шмат журналістаў. Аднак, нягледзячы на ўвесь гэты бум, на шоу-бізнес, імпрэза засталася некамерцыйнай. Гэта значыць, грошай за ўваход на канцэрт ніхто не бярэ. Канцэрт, як і раней, адбываецца ў ляску пад назвай Барык.

Аднак на тле сумнеўных з сённяшняга пункту гледжання шоу-бізнесных поспехаў, галоўнае, мне падаецца, ў іншым. *"У псіхіцы нашых людзей паволі заціраецца тая мяжа, а лепш сказаць – кардон, якім да нядаўняга часу былі падзелены Беларусь і Польшча"*, – зазначыць ананімны аўтар у артыкуле пра другое "Басовішча" ў газеце "Сустрэчы". І гэта сапраўды так. І для беларусаў з Польшчы, і для беларусаў з Беларусі, і для палякаў фэст стаў нагодай, дзякуючы якой можна бліжэй пазнаёміцца і лепш зразумець саміх сябе і сваіх суседзяў.

Накірунак спалучэння шоу-бізнесу, гэта значыць спробы стварэння і раскруткі камерцыйнай папсы, з некамерцыйным характарам фестывалю развіваецца і па сённяшні дзень. Адным з вынікаў "шоу-бізнеснага" накірунку з'яўляецца тое, што на Беласточыне з'яўляецца шмат гуртоў, якія спяваюць па-беларуску раз на год, гэта значыць на "Басовішчы", спецыяльна для якога тлумачацца тэксты на беларускую мову. Жаданне засвяціцца на вялікай сцэне вялікага фестывалю робіць цуды і з нашымі гуртамі. Мне асабіста вядома некалькі выпадкаў, калі менавіта магчымасць паехаць на "Басовішча" была той прычынай, дзяля якой гурт пачынаў спяваць на беларускай мове. Добра гэта ці дрэнна? Нават не ведаю, але пэўная нешчырасць у гэтым усе ж такі прысутнічае.

Калі прааналізаваць, каму даваліся ўзнагароды БАС на працягу апошняга часу, дык можна звярнуць увагу на іх адчайныя спробы стварыць поп-зорку. Менавіта таму на фэст запрашаліся і адзначаліся гурты кшталту "Айшы", *Hasta la Fillsta* ці «Пастскрыптуму», які ўвесь час бегае паміж БПСМ і Маладым фронтам (маўляў, дзе больш заплоцяць) і дэкляруе сваю апалітычнасць. Менавіта таму няма на сёлетнім «Басовішчы" «Новага Неба", *Deviation*, "Кальян". Гурты, што граюць вострую пратэстную музыку, амаль не маюць шансаў на папулярнасць у сытай і стомленай ад гэтай сытасці Польшчы. *"Канцэрты на "Басовішчы" слухае новае пакаленне публікі, якая ад фестывалю патрабуе выключна музыкі, а не палітычных ці нейкіх іншых дэкларацый. Ад першага выпуску фестывалю прайшло 8 гадоў – у гэты прамежак часу паволі адбылася найважнейшая перамена музычнага відовішча ў Барыку. Маханне бел-чырвона-белымі сцягамі надалей выдатна прэзентуецца ў фотааб'ектыве, але арганізатары фестывалю ахвотней карыстаюцца сёння факсамі і сотавымі тэлефонамі, чымсьці лозунгамі пра адраджэнне чагосьці ў імя нечага"* – з сумам адзначыў у 1998 годзе бясменны рэпарцёр "Басовішча" Аляксандр Максымюк.

Накірунак, узяты яшчэ на другім "Басовішчы", працягвае дамінаваць. Гэта паволі пачынае надакучваць. Калі дадаць да гэта скандалы, якія апошнімі гадамі ўзнікаюць паміж беларускімі зоркамі і арганізатарамі фэсту, дык сапраўды становіцца сумна. Арганізаваны сёлета ў Мінску адборачны тур, які ўжо на самым пачатку даводзіць, што адпаведныя знаёмствы маюць большае значэнне за сімпатыі публікі, толькі дапаўняе агульную карціну. Мара пра беларускую рок-зорку, якая дзякуючы сваёй папулярнасці пераканае ўвесь свет у сучаснасці і прыгажосці беларускай мовы, відаць, так і застанецца прыгожай марай. Замест гэтага на "Басовішчы" будуць дурнымі галасамі спяваць салодка-патрыятычныя песні тыя, хто пры любой магчымасці «прабіцца" не тое, што на расейскай, а на кіргізкай мове запяе. Такім чынам, мы маем перад сабой класічную пастку шоу-бізнеса. Папулярнасць, ці, лепш сказаць, магчымасць дасягнення папулярнасці, патрабуе ад арганізатараў адмовіцца ад пэўных патрабаванняў (на маю думку, першае, ад чаго адмовіліся, – гэта шчырасць), але кожны крок да такога "кампрамісу" з'яўляецца крокам да канчатковай здрады ўсім вартасцям, дзяля якіх нібыта і ішлі на гэты кампраміс.

Што ж, можа, за некалькі гадоў гурты з Беларусі, якія на Радзіме спяваюць па-расейску, будуць з посьпехам абкатваць свае беларускамоўныя праграмы выключна на "Басовішчы", а БАСаўцы, разам з «БМА*group*» і надалей будуць марыць пра цудоўную рок-зорку, якая ўздыме ўсю беларускую культуру. А ў канцы не ўтрымаюся і яшчэ раз працытую беластоцкі тыднёвік «Ніва»: *"А што ад "Басовішча" мае наша беларускасць? Рок-музыка ў Гарадку хутчэй за ўсё абуджае сярод публікі эмоцыю, а не беларускую нацыянальную ідэю. Гэта несумненна. Ці ёсць, аднак, тут нейкая вышэйшая звышмузычная каштоўнасць? Усё-такі ёсць. Беларуская мова выйшла са свайго зачараванага кола сарамлівасці. Яна льецца ручаём сучаснай культуры, не здзіўляючы нікога і не абражаючы. Польскія і беларускія гурты выступаюць побач як роўны з роўным. Ці перакладзецца гэта калі-небудзь і на іншыя сферы жыцця? У любым выпадку, усяго табе найлепшага, "Басовішча", і на будучыя гады"*. ■



ПОНЕДЕЛЬНИК, 16 ИЮЛЯ



15.00, 18.00, 23.10 Новости.
15.15 Худ. фильм для детей «Дети капитана Гранта».
16.40 Мультфильм.
17.05 «Морская полиция». Сериал.
18.25 Зона Икс.
18.35 Политические диалоги.
19.05 Д.Сэвидж и Б.Зукова в драме «Потерянные души».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.00 «Человек моря». Сериал.
22.45 Стадион.



15.10 Мультсериал «Покемон».
15.35 «Ералаш».
15.55 Многосерийный фильм «Тени исчезают в полдень».
17.00, 22.30 Вечерние новости.
17.20 Русский экстрим.
17.55 «Воздушные замки». Сериал.
18.55 Жди меня.
20.00 Время.
20.40 «Закон джунглей». Документальный сериал (Би-Би-Си).
21.35 Сериал «Секретные материалы» («X-files»).
22.50 «На футболе» с Виктором Гусевым.
23.30 Комедийный сериал «Полная безопасность».



16.00, 19.00 Вести.
16.30 «Простые истины».Сериал.
17.00 «Государственная граница». Сериал.
18.00 «Каникулы с «Аншлагом».
19.30 Вести-Москва.
19.50 Детектив по понедельникам. «Следствие ведут знатоки».
21.30 Михаил Жванецкий.
22.00 Вести + Подробности.
22.30 Вести-Москва.
22.40 Последний сеанс. «Потерявший».
0.20 «Спорт за неделю».



13.30, 17.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
13.45 «Летние каникулы Антона Чехова». Авторская программа В.Лакшина.
14.40 Мультипликационный фильм.
15.00 Новости
15.10 Кино-детям. «Приключения швейцарской семьи Робинсон». Телесериал (Франция, 1982).
15.35 «В порту». Мультипликационный фильм.
15.50 Музыкальные дома. Музей-квартира М.Н.Ермоловой.
16.15 Архитектурная галерея.
16.30 «Власть факта».
16.40 «Бланш». Сериал (Канада, 1993).
17.40 «Из концертного зала». С.Рахманинов. Концерт №3 для фортепиано с оркестром.
18.25 XX век. Избранное. «Silentium. Судьба Великой княгини Елизаветы Федоровны Романовой».
19.20 «Вечерняя сказка».
19.50 С.Мрожек «Эмигранты». Спектакль театра-студии «Человек». Режиссер М.Мокеев. Часть 1-я.
21.15 После новостей...
21.35 С.Мрожек «Эмигранты». Спектакль театра-студии «Человек». Часть 2-я.
22.30 «Джаз. Традиции и современность».



9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Сериал. «Курортный роман».
11.30 Сериал «Тени исчезают в полдень».
13.30 Старый телевизор.
14.40 Куклы.
15.35 Криминал.
15.50 Сериал. Пета Уилсон в боевике «Ее звали Никита».
17.00 Геннадий Хазанов «Жил был я...».
18.35 Криминал.
19.05 Час сериала. «Граф Монте-Кристо». 1-я серия.
20.15 «Криминальная Россия».
21.50 Сериал. Боевик «Трое».
23.00 Криминал.
23.20 Сериал.«Неприкосаемые».



5.00 День за днем.
5.45 Дорожный патруль.
6.00 День за днем.
8.00 Новости с Андреем Белькевичем.
8.25 Сериал «Агент национальной безопасности».
9.25 Все в сад!
10.05 Ток-шоу «В нашу гавань заходили корабли».
11.15 День за днем.
13.05 Катастрофы недели.
14.00 «Сегодня».
14.30 Сериал «Легенда о Вильгельме Телле».
16.20 Юмористический сериал «Третья планета от Солнца».
16.50 Сериал «Приключения Шерлока Холмса».
18.00 «Сегодня» с Андреем Норкиным.
18.35 Сериал «Экстренный вызов».
19.45 Дорожный патруль.
20.00 «Сегодня».
20.35 Тушите свет.
20.45 Сериал «Тайная служба ее величества».
22.00 «Сегодня».
22.40 Дорожный патруль.
22.55 Сериал «Lexx III».
23.55 Дорожный патруль.



12.30 Деловая Москва.
13.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
13.15 «ИНСПЕКТОР КРЕСС». Детективный сериал (Германия).
14.20 Мир без наркотиков.
14.30 Леонид Куравлев о фильме «БАГДАДСКИЙ ВОР».
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 «Неизвестная война». Документальный сериал (США).
16.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
16.15 «65 лет ГИБДД».
17.15 Все о здоровье в программе «21 кабинет».
18.00 «В ПЛЕНУ СТРАСТИ». Сериал.
18.50 Пять минут с деловой Москвой.
19.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
19.45 Особая папка.
20.10 «ГРАФИНЯ ДЕ МОНСОРО». Сериал.
21.20 «ОТРЯД ПО БОРЬБЕ С МАФИЕЙ». Сериал (Испания).
22.15 Времечко.
22.45 Петровка, 38.
23.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
23.20 Ночной полет.
23.55 Дневник 112-й сессии МОК.
0.05 Интернет-кафе.
0.35 Конец вещания.



16.00 «Дьяволик». Мультсериал.
16.30 «Приключения полевого мышонка». Мультсериал.
17.00 «ДРАКОША И КОМПАНИЯ». Сериал.
18.00 «РАУЗАН». Теленовелла.
19.00 Случайный свидетель.
20.30 «Симпсоны». Мультипликационная серия.
21.00 «ДЕНЬ РОЖДЕНИЯ БУРЖУЯ». Сериал.
22.10 Фантастический триллер «ПОСЛЕДНИЙ СЕКРЕТ».
0.15 Новости.
0.30 Футбольный курьер.



7.10, 23.30 «ЛЮДИ И ГОРЫ». Сериал.
7.40 «ВЕТЕР В СПИНУ». Сериал.
8.30 «Из жизни животных...» Ведущая Н.Истратова.
8.45 Кинематограф XX. Художественный фильм «ЛЕВ ГОТОВИТСЯ К ПРЫЖКУ». Венгрия.
10.30 «Мир без политики». По материалам международных информационных агентств.
11.00 Мультсериал «Суперкнига».
11.25 «Счастливого пути!» Музыкальная программа.
11.45 АСТ-журнал.
12.10 «Чудесные уроки». Домашний логопед.
12.30, 0.00 «МУЗЫКА ЕЕ ДУШИ». Сериал.
13.30 Документальный фильм «Николай и Александра».
15.15 Мультипликационный фильм «Чудесный сад».
15.35 Худ. фильм «ЧЕЛОВЕК В ПРОХОДНОМ ДВОРЕ». 1-я серия.
17.00 Алло, Россия!
17.30 Мужские заботы.
18.00 Научно-популярный сериал «Путеводитель для гурманов». «Вино Нового Света. Чили».
18.35, 3.35 «ЭКСТРАДИЦИЯ». Сериал.
19.30 Документальный фильм «Николай и Александра».
20.30 «Из жизни животных...» Ведущая Н.Истратова.
20.45 Кинематограф XX. Художественный фильм «ЛЕВ ГОТОВИТСЯ К ПРЫЖКУ». Венгрия.
22.00 Мультфильм для взрослых «Легенда о Григе».
22.15 Я Вас любил...
22.30, 2.30 «ЧЕЛОВЕК И МОРЕ». Сериал (Франция).
23.00 «Представляет Большой...» Звезды Большого балета.
1.00 Мальчишник.
1.35 «ХИЩНИК». Сериал (Бразилия). 130-я серия.
3.05 АСТ-журнал.
4.30 Мужские заботы.

ВТОРНИК, 17 ИЮЛЯ



6.30 Доброе утро, Беларусь!
15.00, 18.00, 23.40 Новости.
15.10 «Сказки отца Кастора». Мультсериал.
15.20 «Все на орбиту!» Познавательный сериал для детей.
15.35 «Маленькие Эйнштейны». Сериал для детей.
16.00 Мультфильм.
16.10 Приключенческий сериал «Кавингтон Кросс». 1-я серия.
17.05 «Морская полиция». Сериал.
18.25 Зона Икс.
18.35 «Москва - Минск».
19.00 Боевик режиссера Р.Рэдлера «Динамит»(США).
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама. Информационный канал.
22.00 «Человек моря». Сериал.
22.50 Спорт-курьер.
23.00 Ток-шоу «Будни». «Покупайте белорусское».



8.00, 11.00, 17.00, 22.30 Новости.
8.15 «Воздушные замки». Сериал.
10.15 «Смехопанорама» Евгения Петросяна.
10.50 Библиомания.
15.10 Мультсериал «Покемон».
15.35 Веселые истории в журнале «Ералаш».
15.55 Многосерийный фильм «Тени исчезают в полдень».
17.20 Играй, гармонь любимая! Памяти Геннадия Заволокина.
17.50 «Воздушные замки». Сериал.
18.55 Худ. фильм «Граф Монте-Кристо». 1-я серия.
20.00 Время.
20.40 Боевик «Выкуп».
22.50 Программа «Цивилизация». Карлос Кастанеда.
23.20 Лоренцо Ламас в триллере «Полуночник».



7.00, 8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Вести.
7.15 «Переменка», «Сказка про дурака Володю». Мультфильмы.
7.30 «Москва-Минск».
7.45 «Православный календарь».
7.50 «Дежурная часть».
8.15 «Два рояля». Музыкально - развлекательная программа.
9.00 Моя семья.
10.30 «Санта-Барбара». Сериал.
16.30 «Простые истины».Сериал.
17.00 «Государственная граница». Сериал.
18.00 «Каникулы с «Аншлагом».
19.30 Вести-Москва.
19.50 Худ. фильм «Девушка без адреса». 1957г.
21.40 Чемпионат мира по водным видам спорта. Передача из Японии.
22.00 Вести + Подробности.
22.30 Вести - Москва.
22.40 Худ. фильм «Гувернантка».



13.30, 17.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
13.45 «Мастер». Авторская программа В.Лакшина. Часть 1-я.
15.00 Новости
15.10 Кино-детям. «Приключения швейцарской семьи Робинсон». Телесериал.
15.35 Мультфильм.
15.55 «Последние игры». Док. фильм. Режиссер Б.Галантер.
16.15 «Мы пришли с моря».
16.40 «Бланш». Сериал.
17.40 Сверхнаука. «Язык животных».
18.05 Дворцовые тайны. «Мариинский дворец».
18.30 «Цитаты из жизни». Митрополит Антоний Сурожский.
19.10 «Вечерняя сказка».
19.15 «Ну, погоди!» Мультсериал.
19.50 «И огонь, и пламя». Сериал.
20.45 После новостей...
21.05 «Никитинские вечера».
21.35 Фильмы Ингмара Бергмана. «Музыка во тьме». Худ. фильм.



9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Сериал. Боевик «Трое».
10.25 Криминал. «Чистосердечное признание».
11.30 Сериал. «Тени исчезают в полдень».
13.30 Старый телевизор.
14.45 Впрок.
15.35 Криминал.
15.50 Боевик «Ее звали Никита».
17.00 Геннадий Хазанов. «Жил был я...».
18.35 Криминал.
19.05 Сериал. «Граф Монте-Кристо».
20.15 Совершенно секретно.
21.50 Сериал. Боевик «Трое».
23.00 Криминал.
23.20 Сериал. «Неприкосаемые».



8.00 Новости.
8.25 Тушите свет.
8.35 Кинотеатр ТВ-6. «Джульбарс».
10.15 Сериал «Экстренный вызов».
11.15 День за днем.
12.55 Сериал «Тайная служба ее величества».
14.00 «Сегодня».
14.30 Сериал «Легенда о Вильгельме Телле».
15.40 «Телемагазин в Минске».
16.20 Юмористический сериал «Третья планета от Солнца».
16.50 Сериал «Приключения Шерлока Холмса». «Союз рыжих».
18.00 «Сегодня» с Андреем Норкиным.
18.35 Сериал «Экстренный вызов».
19.45 Дорожный патруль.
20.00 «Сегодня».
20.35 Тушите свет.
20.45 Сериал «Тайная служба ее величества».
22.00 «Сегодня».
22.40 Дорожный патруль.
22.55 Сериал «Lexx III».
23.55 Дорожный патруль.



13.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
13.15 «ИНСПЕКТОР КРЕСС». Детективный сериал.
14.20 Как добиться успеха. Доктор Богданов.
14.30 Музыкальный серпантин.
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 «Неизвестная война». Документальный сериал.
16.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
16.15 «Футбол - игра народная».
16.45 Ступеньки.
17.15 Пласидо Доминго в программе «Большая музыка».
18.00 «В ПЛЕНУ СТРАСТИ». Сериал.
18.50 Пять минут с деловой Москвой.
19.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
19.15 ЛИЦОМ К ГОРОДУ.
20.15 «Графиня Де Монсоро». Сериал.
21.25 «Отряд по борьбе с мафией». Сериал.
22.15 Времечко.
22.45 Петровка, 38.
23.00 СОБЫТИЯ. Время московское.
23.20 Ночной полет.
23.55 «ЦЕЛУЮ РУЧКИ». Худ. фильм.



8.30 Новости.
